**З гісторыі прадпрыемстваў горада**

# «С І Т О М А»: ЧАС ЗМЯНЯЕЦЦА — ЯКАСЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

***Да 60-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА»***

***Б і б л і я г р а ф і ч н ы   п а к а з а л ь н і к***

**Кобрын**

**2020**

ББК 91.9:34.4(4Беи)
С41

**Складальнік:**

***С. Д. Курачук*** – галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

С41 **«СІТОМА»: час змяняецца – якасць застаецца** : бібліяграфічны паказальнік да 60-годдзя з часу заснавання ААТ «««Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 36 с. - (З гісторыі прадпрыемстваў горада).

ББК 91.9:34.4(4Беи)

© Афармленне. Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, 2020

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Бібліяграфічны паказальнік ***«СІТОМА»: час змяняецца – якасць застаецца»*** з серыі «З гісторыі прадпрыемстваў горада» выдадзены да 60-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА».

Завод заснаваны ў 1960 годзе і на працягу дзесяцігоддзяў спецыялізуецца на выпуску слясарна-мантажнай прылады. Змяняліся шыльды прадпрыемства і яго структура, але нязменным заставаўся асноўны кірунак вытворчасці – інструментальны. У свой час завод меў статус прадпрыемства саюзнага значэння, яго прадукцыя была вельмі запатрабаваная на тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюза. Вырабы кобрынскіх майстроў-інструментальшчыкаў па заслугах ацанілі і на мясцовым рынку, і ў замежжы. Прадпрыемства з'яўляецца адзіным у рэспубліцы і вядучым у дзяржавах Садружнасці вытворцам прафесійнай слясарна-мантажнай прылады.

Сёння завод вырабляе больш за 140 найменняў ручной прылады, прызначанай для абслугоўвання любых тыпаў транспарту і абсталявання, дзясяткі мадыфікацый набораў, якія неабходны як у прамысловасці, так і ў быту.

Бібліяграфічны паказальнік мае наступную структуру:

Ад складальніка;

Гісторыка-эканамічны нарыс;

Спіс крыніц;

Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

Выданне прадстаўляе каля 200 крыніц. Уключае артыкулы з перыядычных выданняў, пачынаючы з 1970 года. Творы друку згрупаваны па відах: кнігі, брашуры, главы,

раздзелы з кніг, энцыклапедычныя артыкулы; часопісныя і газетныя артыкулы; найбольш стабільныя электронныя рэсурсы. Кнігі размешчаны ў алфавіце аўтараў, назваў кніг, артыкулы – па гадах у зваротнай храналогіі, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі.

Даведачны апарат прадстаўлены алфавітным спісам перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік.

У выданні прадстаўлены ілюстрацыйны матэрыял, фотаздымкі розных гадоў.

Выдадзены ў Год малой радзімы, паказальнік адрасаваны ўсім, хто займаецца вывучэннем роднага краю, цікавіцца яго гісторыяй, эканомікай, культурай.

# ГІСТОРЫКА-ЭКАНАМІЧНЫ НАРЫС

## ГІСТОРЫЯ

Гісторыя стварэння Кобрынскага інструментальнага завода пачынаецца з 1924 года, калі на ўскраіне горада, у тым месцы, дзе зараз размешчаны вялікія карпусы сучаснага прамысловага прадпрыемства, былі закладзены пілараманы і млын, якія прыводзіліся ў рух ад паравой машыны магутнасцю 100 конскіх сіл. Пазней, у 1928 – 1930 гг., былі ўстаноўлены гонтарэзны і стругальны станкі і яшчэ адна пілараманы. Усё гэта было ўласнасцю аднаго з польскіх прадпрымальнікаў.

У 1940 годзе, з устанаўленнем у Брэсцкай вобласці савецкай улады, прадпрыемства было нацыяналізавана і атрымала назву лесапільнага завода імя С. М. Кірава. Першым дырэктарам завода быў камуніст М. І. Верхавец.

У гады Вялікай Айчыннай вайны прадпрыемства было разбурана, пасля Перамогі пачалося яго аднаўленне. З 1946 па 1950 год пабудаваны кузня, ліцейны цэх і механічная майстэрня. Асноўным прызначэннем прадпрыемства стаў выраб запасных частак і абсталявання для іншых прамысловых прадпрыемстваў.

У 1960 годзе ўрадам Беларускай ССР прынята рашэнне аб пачатку будаўніцтва ў г. Кобрыне інструментальнага завода на базе металаапрацоўчага цэха райпрамкамбіната. Датай заснавання сучаснага інструментальнага завода лічыцца 31 жніўня 1960 года.

Новы этап у яго развіцці прыйшоўся на 1961 год, калі металаапрацоўчую вытворчасць перадалі Міністэрству станкабудаўнічай прамысловасці. У 1964 годзе згодна з

зацверджаным праектам было закончана будаўніцтва корпуса, у якім размясцілася вытворчасць слясарна-мантажнага інструмента. Прадпрыемства спецыялізавалася на выпуску шырокага асартыменту слясарна-мантажнага інструмента і тэхналагічнага абсталявання. Асноўная прадукцыя: ключы гаечныя двухбаковыя, малаткі, зубілы, станкі нажовачныя ручныя, шнэкі, секатары такарна-трубарэзныя станкі ТВ-16, дрэваапрацоўчыя станкі. Праз два гады ўступіў у эксплуатацыю галоўны корпус з сучаснымі механічным, кавальска-прэсавым, тэрмагальванічным і рамонтна-механічным цэхамі. З кожным годам расло прафесійнае майстэрства працоўных. Штат інжынерна-тэхнічных работнікаў папаўняўся выпускнікамі ВНУ Магілёва, Мінска, Масквы.



*Май 1966 г.*
*Калектыў інструментальнага завода*



*Ветэраны Вялікай Айчыннай вайны з кіраўніцтвам завода*

У 1968 годзе заводу перададзены на правах філіяла вытворчы ўчастак у г. п. Давыд-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. Прадпрыемства было ператворана ў Кобрынскае інструментальнае вытворчае аб’яднанне. З кожным годам завод асвойваў усё новыя і новыя віды вырабаў, нарошчваючы аб’ёмы вытворчасці, і да 1971 года больш як удвая перакрыў свае праектныя магутнасці.

***Шлях росквіту***

У 1978 годзе ў вытворчых цэхах аб’яднання налічвалася 682 металарэжучых станкі, 202 адзінкі кавальска-прэсавага абсталявання, 22 паточна-механізаваныя і адна аўтаматычная лінія.

З 16 студзеня 1984 года на працягу 17 гадоў завод паспяхова ўзначальваў Іван Лукіч Лупіш. Прадпрыемства расло і развівалася. Былі пабудаваны нарыхтоўчы, механічны, інструментальны і пакавальны цэхі, рэканструяваны складскія памяш-



канні, пераабсталяваны ліцейны ўчастак, на тэрыторыі пакладзены асфальт, уладкавана ліўневая каналізацыя, з’явілася аўтамабільная стаянка. Завод, на якім працавала 1878 чалавек, працаваў у тры змены, з кожным годам асвойваў новыя віды вырабаў, нарошчваў аб’ёмы вытворчасці.

Зробленыя ў Кобрыне ключы, малаткі, адвёрткі, нажніцы для рэзання металу, таўры, клупы, нажоўкі, дзясяткі мадыфікацый набораў прылад пастаўляліся не толькі ва ўсе рэспублікі СССР і краіны сацыялістычнага лагера, але ў 18 краін капіталістычнага свету. Каля трэці вырабаў прадпрыемства было адзначана дзяржаўным Знакам якасці.

З 1986 года завод – у складзе Беларускага інструментальнага вытворчага аб’яднання.




У 1987 годзе Кобрынскаму інструментальнаму заводу «CITOMA» была прысуджана Міжнародная дыяментавая зорка як прызнанне яго высокіх прафесійных дасягненняў, вынікам якіх з’яўляецца выдатная якасць прадукцыі.

***Усё лепшае – людзям***

Добрыя даходы прадпрыемства дазвалялі плаціць годныя заробкі работнікам, умацоўваць матэрыяльна-тэхнічную базу, паляпшаць умовы працы і побыту.

На тэрыторыі завода з’явіўся буфет. У завадской сталовай работнікі забяспечваліся смачнымі сытнымі абедамі, у рацыён уваходзілі салаты і вітамінныя запраўкі з гародніны, вырашчанай на ўласным участку. Лук, капуста, рэдзька, кінза як сродкі ўмацавання імунітэту падаваліся да стала ў абавязковым

парадку. Для выгоды работнікаў на тэрыторыі прадпрыемства быў адкрыты магазін гародніны, куды разам з беларускімі гароднінай і садавінай завозіліся і заморскія – рэдкія ў той час апельсіны, мандарыны, лімоны.

У спецыялізаванай пральні і швейнай майстэрні можна было прывесці ў належны выгляд спецадзенне. Працавала пральня самаабслугоўвання для мыцця асабістых рэчаў працаўнікоў завода.

У медпункце вялі пастаянны прыём урач-тэрапеўт, гінеколаг і стаматолаг. Актыўна будавалася жыллё. Для забеспячэння вольнага часу работнікаў у клубе інструментальнага завода былі створаны творчыя калектывы.



*Ветэраны завода*

# СЁННЯШНЯЕ




Кобрынскі інструментальны завод меў статус прадпрыемства саюзнага значэння, яго прадукцыя была вельмі запатрабаваная на тэрыторыі ўсяго Савецкага Саюза. З развалам СССР рынкі збыту былі згублены, калектыў паменшыўся ў чатыры разы, пачалі змяняцца кіраўнікі. Адсутнасць адваротных сродкаў і частая змена кіраўніцтва пагражала прадпрыемству банкруцтвам.

З 1996 года назва прадпрыемства – Рэспубліканскае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА». У наменклатуру вырабаў увесь час уносяцца папраўкі, якія арыентуюцца на спажывецкі попыт.

4 мая 2011 года «СІТОМА» ўзначаліў вопытны і дальнабачны кіраўнік Аляксандр Васільевіч Дземідовіч, які шмат зрабіў для выйсця прадпрыемства з крызісу. Завод упершыню за 10 гадоў змог выйсці на чысты прыбытак.

Новы вiток свайго развіцця завод атрымаў, калі ў лютым 2011 г. быў узяты пад апеку ДА «Белвтормет», і паралельна

ўвайшоў у склад холдынгу «Беларуская металургічная кампанія». Адразу ж стала распрацоўвацца праграма па стабілізацыі вытворчых працэсаў, якая ахапіла ўсе сферы жыццядзейнасці прадпрыемства. Зарабіла сістэма паставак металапракату, павялічыў пастаўкі пракату Мінскі трактарны завод. Гэта дазволіла калектыву забыць пра няпоўныя працоўныя дні і тыдні.

ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» – адзіны спецыялізаваны завод у Рэспубліцы Беларусь па выпуску прафесійнай слясарна-мантажнай прылады. У цяперашні час завод вырабляе больш за 140 найменняў ручной прылады, прызначанай для абслугоўвання любых тыпаў транспарту і абсталявання, дзясяткі мадыфікацый набораў, якія неабходны як у прамысловасці, так і ў быту.




Пры стварэнні новых распрацовак на заводзе выкарыстоўваецца сістэма аўтаматызаванага праектавання. Прадпрыемства заслужыла павагу і набыло вялікую колькасць партнёраў за мяжой. Прадукцыя вядома ў краінах СНД і далёкага замежжа. ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» паспяхова экспартуе прадукцыю ў Расію, Украіну, Казахстан.



***Гэта цікава!***

У 1993 годзе зарэгістраваны новы таварны знак – дзве сімвалічныя галоўкі ражковага ключа злучаліся ў выглядзе вылучанай лацінскай літары «S», што адпавядала слоўнікаваму лагатыпу знака «SITOMO», пачатковым літарам ад слоў, якія вызначаюць спецыялізацыю прадпрыемства *(«СИТОМО» – (СИ) слесарный инструмент, (ТО) технологическая оснастка, (МО) металлообработка).*




Толькі фірменны інструмент мае маркіроўку SITOMO BELARUS і ромб з растуленымі ўгары бакамі.

У 2002 годзе завадская сістэма якасці сертыфікавана, у 2010 годзе пацверджана на адпаведнасць патрабаванням СТБ ИСО 9001-2009.




ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО»
ПРАКТИЧНО
УДОБНО
НЕДОРОГО
НАБОРЫ КЛЮЧЕЙ
ГАЕЧНЫХ
В ТЕРМОВАКУУМНОЙ
УПАКОВКЕ
www.sitomo.by
www.sitomo.by






ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО»
ДЛЯ РЕЗКИ
МЕТАЛЛА
НОЖНИЦЫ
www.sitomo.by
www.sitomo.by



***2017 год***

*ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» прызналі лепшым на XXI аптовай выставе-кірмашу тавараў народнага спажывання ў Мінску*



***2016 год***

*Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Андрэй Кабякоў  падчас працоўнай паездкі ў Брэсцкую вобласць наведаў «СІТОМА»*




ОАО ЗАВОД
СИТОМО



**На ААТ працуе калектыў сапраўдных прафесіяналаў і патрыётаў сваёй справы. Жорсткая канкурэнцыя на сусветным рынку інструментаў падштурхоўвае калектыў завода да пошуку новых рашэнняў і новых шляхоў развіцця. А гэта значыць, што наступныя 60 гадоў для прадпрыемства будуць напоўнены яркімі падзеямі, значнымі дасягненнямі, нязменным у якіх застанецца толькі адно – якасць.**



# СПІС КРЫНІЦ


**Белорусское** Полесье : проблемы развития и размещения производительных сил. – Минск : БГУ, 1983.

См. на с. 69.

**Инструментальный** завод. Кобрин : буклет. – Минск : Полымя, 1987.

**Кобрынскі** інструментальны завод // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1979. – Т. 2. – С. 348.

**Кобрынскі** інструментальны завод «СІТАМА» // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 370.

**Кобринский** инструментальный завод // Белорусская ССР : краткая энциклопедия : в 5 т. – Минск, 1979. – Т. 2. – С. 285.

**Кобринский** инструментальный завод «СИТОМО» // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. –С. 100.

**Кобринский** инструментальный завод / Министерство станкостроительной и инструментальной промышленности СССР. – Минск : Полымя, 1989. – 13 с.

**Кобринский** инструментальный завод // Машиностроительные предприятия Белорусской ССР : библиографический указатель книг, журнальных и газетных статей за 1944-1966 гг. – Минск, 1966. – С. 185.

**Ковальчук, О. Н**. Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» / О. Н. Ковальчук // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1 Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 471.

**Козловская, А. Е.** Рост материального благосостояния рабочего класса БССР 1946-1970 / А. Е. Козловская. – Минск : Наука и техника, 1987. – 197 с.

См. на с. 131.

**Предприятия** Кобринского региона. РУПП «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Инвестиционные возможности Брестской области. Кобринский район. – Брест, 2004. – С. 16.

**Региональные** проблемы развития инфраструктуры и межотраслевых производств. – Минск : Наука и техника, 1985.

**Рэспубліканскае** ўнітарнае вытворчае прадпрыемства «Кобрынскі інструментальны завод» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 410. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**Сидор, С. И.** Белорусская ССР в десятой пятилетке / С. И. Сидор. – Минск : «Народная асвета», 1977. – 48 с.

См. на с. 40.

**Фирмы** и предприятия города Кобрина. Государственные промышленные предприятия. Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Кобрин : информационно-хозяйственный справочник. - Międzyrzec Podlaski, 1999. – С. 45-46.

См. на с. 196.

**60 гадоў** з часу заснавання адкрытага акцыянернага таварыства «КІЗ СІТОМА» (1960) // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2018. - С. 157.

**Елизарова, Ж.** Во имя родного предприятия / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2019. – 27 лістапада. – С. 5 : фот.

О Кобринском инструментальном заводе «СИТОМО».

**Савчук, М.** Иван Лупиш: «Мы все годы сражались за завод» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. - 6 ноября (№ 45). - С. 2-3 : фот.

17 лет успешно возглавлял Кобринский инструментальный завод И. Л. Лупиш.

**Бакун, Е.** Когда в душе живут воспоминания / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. - 29 верасня. - С. 4.

Кобринский инструментальный завод «СИТОМО»: время и люди.

**Белов, Д.** Новая продукция от «Ситомо» / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2017. - 22 лістапада. - С. 3.

Завод «СИТОМО» представляет новинку — набор инструмента для технического обслуживания и ремонта транспортных средств.

**Жук, Е.** Новинка от «Ситомо» / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. - 10 ноября. - С. 7.

Кобринский завод «СИТОМО» выпускает новый набор инструментов.

**Мельнік, Р.** У фармаце давяральнага дыялогу / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2017. - 29 сакавіка. - С. 2.

Эканамічная сітуацыя на Кобрынскім інструментальным заводзе «СІТОМА».

**Пальто, К.** Признали лучшими / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2017. - 28 кастрычніка. - С. 3.

На XXI оптовой выставке-ярмарке товаров народного

потребления «Культбытхозтовары» в Минске ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» признали лучшим за профессионализм в работе с посетителями.

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг за 2015 год ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Кобрынскі веснік. - 2016. -2 красавіка. - С. 10.

**Дубина, Л.** Освоили новое производство / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 13 лютага. - С. 3.

**Бондарчук, Т** Времена меняются - качество остаётся / Татьяна Бондарчук // Металлург. Газета со стальным характером. – 2015. – 10 декабря.

Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» отмечает свой юбилей - 55 лет со дня образования.

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг за 2014 год ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Кобрынскі веснік. - 2015. - 1 красавіка. - С. 7.

**Нижник, Н.** Снижаются затраты / Наталья Нижник // Кобрынскі веснік. - 2015. - 18 лістапада. - С. 3.

О программе по энергосбережению на ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО».

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг за 2013 год ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Кобрынскі веснік. - 2014. - 29 сакавіка. - С. 10.

**Годовой** отчёт эмитента ценных бумаг за 2012 год ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Кобрынскі веснік. - 2013. - 30 сакавіка. - С. 10.

**Мельнік, Р.** Расіяне задаволеныя якасцю «Сітома» / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2013. - 10 красавіка. - С. 1.

**Новая** продукция «Ситомо» // Кобрынскі веснік. - 2013. - 17 жніўня. - С. 2.

На ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» налажен выпуск восьми новых наименований поковок.

**Федаровіч, І.** Завадчане канкурэнцыі не баяцца / Ігар Федаровіч ; фота І. Сідарука // Кобрынскі веснік. - 2013.- 28 верасня. - С. 2.

ААТ «Кобрынскі завод «Сітома» фактычна завяршыў рэалізацыю праекта года па распрацоўцы тэхналагічнага працэсу.

**Годовой** отчет эмитента ценных бумаг за 2011 год ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» // Кобрынскі веснік. - 2012. - 31 сакавіка. - С. 12.

**Орлова, И.** СИТОМО - это знак качества / Ирина Орлова // Народная газета. - 2012. - 10 студзеня. - С. 7.

**Савчук, М.** Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2012. - 2 февраля. - С. 2.

Завод посетил зам. главы Администрации Президента Республики Беларусь А. Н. Тур.

**Сидорук, И**. «Без инноваций и новых технологий прорыв невозможен» : убеждён директор ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» Александр Демидович / Игорь Сидорук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 8 верасня. - С. 4.

**Степанюк, О.** На «СИТОМО» знают, как сберечь каждый киловатт / Олег Степанюк ; [подготовил] Игорь Сидорук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 24 лістапада. - С. 2.

О том, как решаются на предприятии вопросы энергосбережения.

**Тоболич, А.** «СИТОМО»: главное подобрать нужный ключ / Адам Тоболич ; фото Валерия Короля // Заря. - 2012. – 1 декабря. - С. 5.

**Федаровіч, І.** Кавальскія агністыя будні / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2012. - 29 лютага. - С. 3.

Аб майстру – кавалю гарачай штампоўцы інструментальнага завода К. Мілас.

**Григорьева, А.** Стратегические объекты для исполкомовских инвестиций / Анастасия Григорьева // Экономическая газета. - 2011. - 9 сентября. - С. 4.

Акции Кобринского инструментального завода выставляются на продажу.

**Демидович, А**. «Ситомо»: второе дыхание / Александр Демидович ; [беседовала] Анна Гром // Кобрынскі веснік. - 2011. - 23 ліпеня. - С. 4.

Инструментальный завод включён в состав государственного объединения «Белвтормет».

**Дземідовіч, А**. Пераўзбраенне з упэўненым вектарам у будучыню / Аляксандр Дземідовіч ; [гутарыў] Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 22 кастрычніка. - С. 2.

Інструментальны завод «Сітома» выйшаў на новы ўзровень.

[**Інструментальны** завод Сітома»] // Кобрынскі веснік. - 2011. - 20 жніўня. - С. 1.

Упершыню за 10 гадоў інструментальны завод «Сітома» выйшаў на чысты прыбытак.

**Жук, Е.** «Ситомо» вышел на прибыль / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2011. - 5 августа. - С. 2 ; Кобрин-информ. - 2011. - 11 августа. - С. 3.

**Охремук, Л.** С финансовым уклоном / Лариса Охремук // Заря. – 2011. – 21 мая. – С. 3.

ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» предоставлена государственная поддержка.

**Сергеев, И**. Шанс для «Ситомо» / И. Сергеев // Заря. - 2011. - 4 августа. - С. 2.

На Кобринском инструментальном заводе идет модернизация.

**Максимчик, А**. По широкому спектру вопросов / Алексей Максимчик // Кобрынскі веснік. - 2010. - 6 кастрычніка. - С. 1.

На областной конференции – о проблемах инструментального завода.

**В комитете** госконтроля // Кобрынскі веснік. - 2009. - 21 лістапада. - С. 2.

Результаты проверки РУПП «СИТОМО».

**Ковальчук** Олег Николаевич : некролог // Кобрынскі веснік. - 2009. - 12 снежня. - С. 2.

Ушёл из жизни директор РУПП «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО» О. Н. Ковальчук.

**Михалкевич, И.** Жизнь бьют ключом / Иван Михалкевич // Национальная экономическая газета. - 2009. - 26 мая. - С. 3.

**Магдысюк, С.** Мораторий отменяется : государство снимает запрет на сделки с акциями / Сергей Магдысюк // Заря. - 2008. - 24 июля. - С. 2.

Акции инструментального завода планируется выставить на продажу.

**Пянко, А**. Рыночный вектор «Ситомо» / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 31 сакавіка. - С. 1.

Инструментальный завод на российском рынке.

**Кукса, М.** Шанс для «СИТОМО» / М. Кукса // Заря. – 2006. – 13 апреля.

**Пянко, А.** Новый бизнес – план «СИТОМО» / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 8 красавіка. – С. 2.

**По заказу** минских тракторостроителей. – Заря. – 2005. – 20 декабря. – С. 2.

Кобринский инструментальный завод «Ситомо» заключил договор на поставку слесарного инструмента с Минским тракторным заводом.

**Кукса, М. «**СИТОМО» – качественный инструмент. Кобринский инструментальный завод осваивает рынки зарубежья / М. Кукса // Заря. – 2004. – 7 декабря. – С. 2.

**Максимчик, А.** Семьёй единой / А. Максимчик // Кобрынскі веснік. – 2004. – 25 верасня. – С. 3.

**Пянко, А.** «Сэрца» завода ў надзейных руках / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2004. – 24 ліпеня. – С. 3.

Ветэран інструментальнага завода К. В. Шварко.

**Год 2002-й:** что он нам принёс // Заря. – 2003. – 30 января. – С. 1-2.

Итоги работы народнохозяйственного комплекса Брестской области, упоминается Кобринский район и Кобринский инструментальный завод.

**Леонтьев, М.** Российский вектор «Ситомо» / М. Леонтьев // Заря. – 2003. – 19 июня. – С. 2.

**Не было** равных экспонатам «СИТОМО» // Заря. – 2003. – 6 ноября. – С. 1.

На международной выставке-ярмарке «Машиностроение – 2003» в Москве.

**Пянко, А.** Урокі на… сёння / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 25 студзеня. – С. 3.

Прафсаюзны камітэт механасбораннага цэха на інструментальным заводзе «СІТОМА».

**У «Ситомо»** новый заказчик // Заря. – 2003. – 22 мая. – С. 1.

У Кобринского инструментального завода «Ситомо» появился новый заказчик – завод в Калининграде, специализированный на сборке легковых автомобилей.

**Леонтьев, М.** Неуютно «СИТОМО» на рынках / М. Леонтьев // Заря. – 2002. – 3 августа (№ 86). – С. 4.

**Пачтароў, І.** Што на рыначным гарызонце? / І. Пачтароў // Кобрынскі веснік. – 2002. – 16 студзеня. – С. 2.

Гутарка з дырэктарам інструментальнага завода «СІТОМА».

**Пянко, А.** Бездакорная рэпутацыя / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 24 снежня. – С. 2.

Аб майстры інструментальнага завода «СІТОМА» А. Цылько.

**Пянко, А.** І ў рэгіёнах канкурэнцыя / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 6 ліпеня. – С. 4.

Гутарка з дырэктарам інструментальнага завода «СІТОМА».

**Пянко, А.** Сустрэча з інструментальшчыкамі / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2002. – 27 красавіка. – С. 1.

Адбылася сустрэча інфармацыйна-кансультацыйнай групы райвыканкама з калектывам інструментальнага завода «СІТОМА».

**Антыкрызісная** прапаганда ў дзеянні // Кобрынскі веснік. – 2001. – 30 мая. – С. 3.

Гутарка з дырэктарам інструментальнага завода «СІТОМА» І. Пачтаровым.

**Игорь Почтарев**: «Наш главный козырь – высокое качество» // Кобрынскі веснік. – 2001. – 20 кастрычніка. – С. 2.

Интервью с директором завода «СИТОМО».

**Пянко, А.** Сельскагаспадарчы год завода / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2000. – 5 студзеня. – С. 2.

**Лупіш, І. Л.** Завод працуе, жыве / І. Лупіш // Кобрынскі веснік. – 1999. – 10 сакавіка. – С. 2.

**Лупіш, І. Л.** Наша апора – уласныя сілы / І. Лупіш // Кобрынскі веснік. – 1999. – 25 верасня. – С. 2.

**Пянко, А.** «СІТОМА» побач з «Сіменсам» / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1999. – 13 кастрычніка. – С. 2.

Кобрынскі інструментальны завод удзельначаў у міжнароднай выстаўцы «Машынабудаванне-99» у Маскве.

**Кукса, М.** Первая «ласточка» в городе на Неве / М. Кукса // Заря. – 1998. – 5 марта. – С. 1.

У Кобринского инструментального завода «СИТОМО» полпред в Санкт-Петербурге.

**Кукса, М.** «СИТОМО» на выставке в Кельне / М. Кукса // Заря. – 1997. – 8 апреля. – С. 1.

На выставке-ярмарке в германском городе Кельне были представлены изделия Кобринского инструментального завода «СИТОМО».

**Пянко, А.** Бясплатнае – не стратнае / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 2 ліпеня. – С. 2.

Сталовая інструментальнага завода.

**Пянко, А.** Якасць работы – катэгорыя рыначная / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1997. – 21 мая. – С. 2.

Былы інструментальны завод цяпер завод слясарнага інструмента тэхналагічнай аснасткі і металаапрацоўкі («СІТОМА»).

**Сверкунов, В.** Кобринский «СИТОМО» принял Декларацию… / В. Сверкунов // Национальная экономическая газета. – 1997. – 7 мая. – С. 5.

Декларация о политике в области качества продукции на Кобринском инструментальном заводе.

**Імёны** на першай старонцы // Кобрынскі веснік. – 1996. – 17 студзеня. – С. 1.

Аляксандр Андрэевіч Гуль – старэйшы работнік інструментальнага завода.

**Невидимая, Н.** Экономическое чудо зреет в провинции / Наталья Невидимая // Народная газета. - 1996. – 27 сакавіка. – С. 2.

**Якасць** сёння – дабрабыт заўтра // Кобрынскі веснік. – 1996. – 1 лістапада. – С. 2.

Гутарка з дырэктарам інструментальнага завода «СІТОМА» І. Л. Лупішам.

**Імя** на першай старонцы // Кобрынскі веснік. – 1995. – 22 лістапада. – С. 1.

Больш 20 гадоў працуе на інструментальным заводзе слесар-інструментальшчык М. В. Глухой.

**Леонтьев, М.** На рынки зарубежья / М. Леонтьев // Заря. – 1995. – 24 января. – С. 1.

В 1995 г. Кобринский инструментальный завод настойчиво ищет выход на рынки зарубежья.

**Если не молоток**, то подкова… // Заря. – 1994. – 6 сентября. – С. 2.

На вопросы корреспондента «Зари» отвечает директор Кобринского инструментального завода И. Л. Лупиш.

**Хільчук, М.** З разлікам на ўласныя сілы і здольнасці / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1994. – 26 лістапада. – С. 2.

**Кобринский** инструментальный завод // Заря. – 1993. – 11 мая. – С. 3.

**Кукса, М.** Обжигает и бодрит рынок / М. Кукса // Заря. – 1993. – 4 мая. – С. 2.

Экономика Брестской области, упоминается Кобринский инструментальный завод.

**Кобринский** ключик – бриллиантовый // Заря. – 1992. – 13 июня. – С. 1.

Инструментальному заводу присуждена награда «Международная бриллиантовая звезда».

**Кукса, М.** По тонкому льду / М. Кукса // Заря. – 1992. – 27 февраля. – С. 2.

На Кобринском инструментальном заводе проходная не закрыта на замок, но металл на исходе.

**Леонтьев, М.** Раскошелимся и выкупим завод / М. Леонтьев // Заря. – 1992. – 14 марта. – С. 1.

Есть намерение сделать инструментальный завод г. Кобрина акционерным обществом.

**Кукса, М.** Пьем воду из одного колодца / М. Кукса // Заря. – 1991. – 30 июля. – С. 2.

Беседа с директором Кобринского инструментального завода И. Л. Лупишем.

**Лупиш, И. Л.** Надейся на «ИНТОС», а сам не плошай / И. Л. Лупиш // Заря. – 1990. – 12 декабря. – (Экономика. Поворот к рынку).

Интервью с директором Кобринского инструментального завода.

**Сарычёв, В.** На выживание? / В. Сарычёв // Заря. – 1988. – 25 мая.

**Бурдыко, В.** Вполнакала идет социалистическое соревнование на Кобринском инструментальном заводе / В. Бурдыко, М. Кукса // Заря. – 1987. – 7 апреля.

**Кукса, М.** Напаўсілы, фармальны: ідзе сацыялістычнага спаборніцтва на інструментальным заводзе / М. Кукса, В. Бурдыка // Камуністычная праца. – 1987. – 31 сакавіка.

**Бурдыка, В.** Валянцін Ганчароў: «Прагрэс – гэта кожнага сэрца агонь» / В. Бурдыка // Камуністычная праца. – 1986. – 15 студзеня.

**Бурдыка, В.** Час не церпіць / В. Бурдыка // Камуністычная праца. – 1986. – 12 ліпеня.

Работа партыйнай арганізацыі Кобрынскага інструментальнага завода па выкананні рашэнняў XXVII з'езда КПСС.

**Мацина, В.** Перестраиваться, а не подстраиваться / В. Мацина // Заря. – 1986. – 5 апреля.

Статья бригадира комплексной бригады Кобринского инструментального завода, члена ГК КПБ, делегата XXVII съезда КПСС.

**Мацина, В.** О том, что радует и тревожит / В. Мацина // Заря. – 1986. – 17 января.

Рассказывает бригадир Кобринского инструментального завода, делегат XXVII съезда КПСС.

**Цароў, М.** Сярод людзей / М. Цароў // Камуністычная праца. – 1986. – 29 ліпеня.

Пра Кашавую, загадчыка склада інструментальнага завода.

**Драпко, А.** Здольны працаваць лепш / А. Драпко // Камуністычная праца. – 1985. – 2 ліпеня.

Інструментальнае вытворчае аб'яднанне.

**Шостак, Д.** Коэффициент… за приписки / Д. Шостак // Заря. – 1984. – 24 февраля.

**У кобринских** инструментальщиков // Промышленность Белоруссии. – 1983. - № 11. – С. 13 : фото.

**Даращук, Т.** Каштоўная паўтарэннем / Т. Даращук // Камуністычная праца. – 1982. – 18 мая.

**Нясцюк, С.** Прастор для рабочай ініцыятывы / С. Нясцюк // Камуністычная праца. – 1982. – 2 сакавіка.

**Мацына, В.** Вялікія задачы абавязваюць / В. Мацына // Камуністычная праца. – 1981. – 28 лютага.

**Амельянюк, М.** За высокую дысцыпліну працы / М. Амельянюк // Камуністычная праца. – 1980. – 20 мая. – С. 2.

Многім рабочым даў пуцёўку ў жыццё кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, токар інструментальнага вытворчага аб'яднання А. М. Жданаў.

**Тарасевіч, В.** Дзе шукаць рэзервы / В. Тарасевіч // Звязда. – 1980. – 29 студзеня.

**Хільчук, М.** Завод мой – дом мой / М. Хільчук // Камуністычная праца. – 1980. – 1 мая.

**Хільчук, М.** У передавым калектыве / М. Хільчук // Камуністычная праца. – 1980. – 4 лістапада.

**Шынюк, Я.** Быць першымі – гэта адказна / Я. Шынюк // Камуністычная прца. – 1980. – 21 жніўня.

**Акімава, В**. Яго званне – рабочы / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1978. – 13 ліпеня. – С. 2.

Токар інструментальнага вытворчага аб'яднання А. М. Жданаў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, яму аказана высокае давер'е - працаваць з асабістым кляймом.

**Амельянюк, М.** Лічым найпершым абавязкам / М. Амельянюк // Камуністычная праца. – 1978. – 7 лістапада.

**Амельянюк, М.** У 80 зарубежных краін / М. Амельянюк // Камуністычная праца. – 1978. – 22 чэрвеня.

Інструментальнае вытворчае аб'яднанне пастаўляе прадукцыю ў 80 краін.

**Балашоў, В.** Рабочае слова цвёрдае / В. Балашоў // Камуністычная праца. – 1978. – 10 чэрвеня.

**Вавула, А.** Абрасла творчая актыўнасць / А. Вавула // Камуністычная праца. – 1978. – 21 лістапада.

**Дакучыц, У.** Наватарства – патрэба рабочага / У. Дакучыц // Камуністычная праца. – 1978. – 19 студзеня.

**Ивановская, В.** Паўгадавы-датэрмінова / В. Ивановская // Камуністычная праца. – 1978. – 1 ліпеня.

**Кашапай, Г.** Мацнеем у спаборніцтве / Г. Кашапай // Камуністычная праца. – 1978. – 23 лістапада.

**Лебедев, Г.** Выбор цели / Г. Лебедев // Заря. – 1978. – 4 августа.

О токаре Кобринского инструментального объединения В. Мацине.

**Сацыялістычныя** абавязацельствы калектыву Кобрынскага інструментальнага вытворчага аб'яднання на 1978 год // Камуністычная праца. – 1978. – 26 студзеня.

**Цароў, М.** У заводскім музеі / М. Цароў // Камуністычная праца. – 1978. – 13 мая.

Аб музеі Кобрынскага інструментальнага аб'яднання.

**Бобков, А. А.** Профилактика вибрационной болезни на Кобринском инструментальном заводе / А. А. Бобков [и др.] // Здравоохранение Белоруссии. – 1977. - № 9. – С. 74-75.

**Лебедев, Г.** Издержки «второго дыхания» / Г. Лебедев // Заря. – 1977. – 25 августа.

**Акімава, В.** Кіраўнік змены / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1976. – 23 лістапада.

**Віткоўскі, Г.** Стратам рабочага часу – заслон / Г. Віткоўскі // Камуністычная праца. – 1976. – 9 снежня.

**Дрозд, П.** Камуністы і спаборніцтва / П. Дрозд // Камуністычная праца. – 1976. – 17 лютага.

**Акімава, В.** Каваль Валянцін Ганчароў – ударнік пяцігодкі / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1975. – 28 жніўня.

**Герка, Н.** Член ВЛКСМ Георгій Кашапаў / Н. Герка // Камуністычная праца. – 1975. – 22 ліпеня.

Аб рабочым інструментальнага завода.

**Сяргееў, М.** Дырэктар / М. Сяргееў // Камуністычная праца. – 1975.- 11 сакавіка.

Аб дырэктары інструментальнага завода Швяцове.

**Акімава, В.** Як заўсёды ў страі ветэран / В. Акімава // Камуністычная праца. – 1974. – 24 студзеня.

Аб М. П. Фамічова – рабочым інструментальнага завода.

**Цароў, М.** Яе прафесія / М. Цароў // Камуністычная праца. – 1974. – 12 снежня.

Аб рабочай інструментальнага завода Алене Аляшчук.

**Бакацюк, У.** Пасвячэнне ў рабочыя / У. Бакацюк // Камуністычная праца. – 1973. – 26 красавіка.

**Ганчароў, В.** Гадавы план – за дзевяць месяцеў / В. Ганчароў // Камуністычная праца. – 1973. – 20 лютага.

**Царёв, Н.** История завода / Н. Царёв // Заря. – 1973. – 27 ноября.

**Атрашкевіч, М.** Прыклад лепшых / М. Атрашкевіч // Камуністычная праца. – 1972. – 10 жніўня.

**Казачук, Г.** Музей працоўнай славы / Г. Казачук // Камуністычная праца. – 1972. – 17 кастрычніка.

**Цароў, М.** Сын камуніста / М. Цароў // Камуністычная праца. – 1971. – 16 лістапада.

Аб токары інструментальнага завода А. Захарэвіче.

**Зінкевіч, Б.** Інструментальшчыкі выяўляюць рэзервы // Камуністычная праца. – 1970. – 17 сакавіка.

**Лапшин, Ю.** Закон роста / Ю. Лапшин // Заря. – 1970. – 6 ноября.

О достижениях коллектива Кобринского инструментального завода.

**Зінкевіч, Б.** Інструментальшчыкі выяўляюць рэзервы / Б. Зінкевіч. – Камуністычная праца. – 1970. – 17 сакавіка.

**Пераможцы** – інструментальшчыкі // Камуністычная праца. – 1970. – 21 мая.

# СПІС
# перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Белорусская нива
Брестский калейдоскоп
Вечерний Брест
Заря
Звязда
Камуністычная праца
Кобрин-информ
Кобрынскі веснік
Металлург. Газета со стальным характером
Народная газета
Рэспубліка
Экономическая газета

# ЗМЕСТ

**Ад складальніка** 3

**Гісторыка-эканамічны нарыс** 5

**Гісторыя** 5

*Шлях росквіту* 7

*Усё лепшае – людзям* 8

**Сённяшняе** 10

*Гэта цікава!* 12

**Спіс крыніц** 17

**Спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік** 34

Даведачнае выданне

# «С І Т О М А»: ЧАС ЗМЯНЯЕЦЦА — ЯКАСЦЬ ЗАСТАЕЦЦА

**Бібліяграфічны паказальнік**
***да 60-годдзя з часу заснавання***
***ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА»***

Камп'ютарная верстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп'ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі
вул. Маршала Жукава, 12,
225301, г. Кобрын, Брэсцкая вобласць